=НАША= БУДУЧЫНА

Цана асобнага нумару 300 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкаў да хаты 1200 м. п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вертаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 400 мк., сярод тэксту 600 мк. і на апошняй страніцы 200 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 5. **Субота, 3-га лютня 1923 г.** **Год II.**

Мір ці вайна?

Хаця ўрады ўсіх эўропэйскіх дзяржаваў стараюцца афіцыяльна ўпэўніць насяленьне, што палітыка міру зьяўляецца іх найбольшаю і найважнейшаю задачаю, аднак грамадзянства амаль што кожнае дзяржавы ня зможа не задумацца сур'ёзна над тым, што нясе з сабою бліжэйшы час: сапраўдны мір і спакойства сьвету, ці новую ўсеэўропэйскую, а навет і сусьветную калатню, а за ёю пэўна што і далейшы размах соцыяльнае рэвалюцыі.

Мінулая вайна ўсім сваім пярунiстым жахам прайшла праз нашу зямельку, напаіла яе крывёю народаў, спаляндравала яе й без таго слабую гаспадарку і абяздоліла мільёны людзей, быўшых у выгнаньні па ўсёй Маскоўшчыне, Сярэдняй Азіі і Сыбіры.

Хто-ж можа жадаць паўтарэньня чагосьці падобнага?

Ведама, што ня толькі працоўныя масы Беларускага Народу, але і ўсе працоўныя масы Эўропы, пролетарыят кожнага краю вайны ня хоча і трэба спадзявацца, што ў рашучы момэнт да яе не дапусьціць.

Вайны можа жадаць толькі ненажорлівы капіталізм, сучасная імпэрыялістычная эўропэйская буржуазія, якая добра ўмее абрабляць кішанёвыя інтарэсы, як у часе міру, так і падчас вайны.

Шуканьне рынкаў, стычнасьць ў адным якім-небудзь пункце эканамічных інтарэсаў дзьвюх, ці некалькіх сучасных капіталістычных дзяржаваў заўсёды даводзіць да варожых адносін паміж зацікаўленымі старонамі, а часам і да збройнае разьвязкі.

Вайны тымчасам нідзе ўжо няма. Разьбіўшы грэкаў, туркі гэтым зьліквідавалі з імі вайну.

Але, ці ёсьць у Эўропе сапраўдны мір, ня толькі той папяровы мір, аб якім пісалася ў вэрсальскім дагаворы?

Не прыглядаючыся доўга да апошніх падзеяў у Рурскім вокрузе і ў Клайпэдзе, можна адважна адказаць, што акупацыя французамі Руру і паўстаньне літоўцаў у Клайпэдзе гэта нішто іншае, як вайна, толькі вайна ў яе сучаснай пасьляваеннай форме ў пэрыяд незаметнага поступу соцыяльнае рэвалюцыі, соцыяльных зьменаў у жыцьці кожнага народу.

Антанта прамаўчала ў свой час справу захапленьня палякамі Віленшчыны, трэба спадзявацца, што прамаўчыць яна і здарэньне з Клайпэдаю. Палітыка адбытых фактаў—як-бы ўваходзіць у нейкае абычаёвае міжнароднае права.

Тым больш, што Літва мае большыя правы на заселеную літоўцамі Клайпэду, чымся ў Польшчы магло знайсьціся правоў на сталіцу колішаня Беларуска-Літоўскае Дзяржавы—Вільню.

Балюча церпячы свой уласны нацыянальны падзел ад Рыжаскага міру, Беларускі Народ ня можа жадаць гэткае-ж самае бяды кожнаму іншаму народу, тым болей суседнему, зьвязанаму з намі сьветлаю мінуўшчынай, народу Літоўскаму.

Клайпэдскае і Рурскае здарэньні, альбо, як цяпер кажуць афіцыяльнаю моваю прэм'ераў Эўропы, „інцыдэнты“, магчыма, што й ня выклічуць сабою збройнае калатні народаў, бо кожны народ гэтае калатні баіцца.

Польскі ўрад пасьпяшыў заявіць, што ён ня зробіць ніякіх крокаў, нязгодных з тактыкай саюзьнікаў (трэба чытаць — французаў). Іншага нічога й не заставалася рабіць Польшчы пасьля паважнага ўнутранага неспакою ды эканамічнага бязладзьдзя, калі патрэбавалася завесьці моцны ўрад „папраўленьня Рэспублікі“ з чалавекам ваенным, гэнаралам на чале.

Наагул. як пераможаныя ў мінулай сусьветнай вайне, так і перамогшыя дзяржавы гэтак падцяты вайною з боку гаспадарчага, што адважыцца на новае праліцьцё крыві працоўных масаў могуць толькі ў самым крайнім выпадку.

Да таго яшчэ хай не забываюцца буржуазныя ўрады сучаснай Эўропы, што мінулую вайну пачалі манархі, а скончылі яе народы і надта проста можа здарыцца—калі пачне вайну імпэрыялістычная буржуазія, дык скончыць яе можа эўропэйскі пролетарыят.

С. Кл.

Чаго дабіваецца Францыя?

Эўропэйскі мір, мір усяго сьвету вісіць на валасінцы. Яўная, загадзя прадсказаная няўдача з заняцьцем Рурскага басэйну ня прыдала разуму, ня спыніла Францыю. Наадварот, і далей яна пасылае па адрэсе Нямеччыны новыя, яшчэ больш небясьпечныя пагрозы і яшчэ больш трывожыць гэтым цэлы культурны сьвет, яшчэ больш узмацоўвае страх і трывогу за заўтрашні дзень.

Да вайны палоханьне Эўропы „панцырованым кулаком“, гульня мірам і спакойствам Эўропы была вынятковаю прывілегій Вільгэльма. Ахопленая шовінізмам Францыя як быццам маніцца ўзяць цяпер на сябе гэту сумную ролю і гэтым замяніць адсутнага Вільгэльма.

Што-ж, аднак-жа, піхае Францыю на рызыку новае вайны? Што яе, нарэшце, гэтак прыцягвае да Рурскага басэйну?

Сам па сабе Рурскі басэйн зьяўляецца вельмі невялікім і па прасторы і па насяленьні районам Нямеччыны. Але-ж значэньне яго дзеля ўсяе народнае гаспадаркі надта вялікае. Гэты район мае вельмі вялікія натуральныя багацьці, сярод якіх першае месца займае каменны вугаль.

Ведама, якую ролю ў сучаснай прамысловасьці грае каменны вугаль. Краі, што ня маюць яго даволі ў сябе, павінны яго ўвозіць дзеля патрэбаў сваe прамысловасьці з гэткіх краёў, дзе яго зашмат і гэткім чынам яны знаходзяцца ў пэўнай залежнасьці ад гэтых апошніх.

У гэткім палажэньні знаходзіцца Францыя. Яе гадавая патрэба ў каменным вуглі выказваецца ў ліку каля 55 мільёнаў тоннаў. У сваіх уласных капальнях яна можа дабыць кожны год толькі 30 мільёнаў тоннаў. Італія, якая разам з Бэльгіяю прылучылася да выступленьня Францыі, мае гадавую патрэбу ў каменным вуглі ў 9—10 мільёнаў тоннаў, а дабывае ў сваіх капальнях толькі паўмільёна тоннаў. Бэльгія, хаця й пакрывае ўласным здабываньнем патрэбу ў вуглі (25 мільёнаў тоннаў) але ў пэўным увозе ўсё-ж такі мае патрэбу. Вугаль гэтыя краі ўвозілі, галоўным чынам, з Англіі і ў пэўнай меры з Нямеччыны. У першай гадавае патрэба вугля складае каля 200 мільёнаў тоннаў, а дабываецца там 270 мільёнаў тоннаў, у другой—патрэба і дабываньне каля 215 мільёнаў тоннаў, пры чым каля паловы дабываецца ў Рурскім басэйне. Напр., у 1913 г. у Рускім басэйне выкапана 114 мільёнаў тоннаў каменнага вугля.

Дзеля гэтага будзе вельмі блізкім да праўды, на грунце прыведзеных даных, вось які вывад: Францыя маніцца адрэзаць ад Нямеччыны і захапіць у свае рукі Рурскі район з тым, каб: 1) забясьпечыць сябе каменным вуглем, 2) аслабіць гаспадарчую моц Нямеччыны, а з гэтым і яе ваенную сілу, 3) збавіць сябе ад залежнасьці ад Англіі ў сэнсе каменнага вугля. Гэты апошні пункт зусім адкрыта выказваецца ў шмат якіх артыкулах вядомых француcкіх газэтаў і яго гэтак-жа сама адкрыта выказаў італьянскі „прэм'ер“ Мусолініі ў аднэй з сваіх прамоваў па пытаньні аб Руры.

Адсюль дзеля нас робіцца ясна і нэўтральная пазыцыя Англіі. Ангельская дыплёматыя, якое нікому на сьвеце яшчэ не ўдалося ашукаць, вельмі добра разумее ўсе тайныя імкненьні і жаданьні Францыі і апошняя ад яе граз гэта ніякае падмогі ў Рурскім выступленьні не адтрымала. Але рашуча выказваючыся проці Рурскае апэрацыі, яна разам з тым пальцам аб палец ня стукнула дзеля таго, каб чым-нібудзь памагчы ў гэтым выпадку Нямеччыне.

Як заўсёды, Англія й тутака праводзіць грунтоўную пазыцыю свае палітыкі: не дапусьціць узмацненьня на контынэнце аднае якое-нібудзь дзяржавы. Расея страшэнна й надоўга аслаблена, няхай Францыя з Нямеччынай далей аслабляюць сябе узаемнымі непаразуменьнямі ды ўзмацоўваюць Англію яшчэ далей.

Гэтак выглядае сапраўдны сэнс тае трагэдыі, якая цяпер разыгрываецца на берагох Рэйну, і ў якой гэткую няўдзячную ролю грае Францыя. Але хто можа перарваць гэту гібельную гульню, хто можа ўхіліць і крываваю разьвязку, што пагражае Эўропе новымі бяздольлямі няшчасьцяў і разрухаў.

Разумеецца, што не ад імпэрыялістычных вярхоў дзяржаваў, не ад капіталістычных іх кругоў, можна чакаць ратунковага кроку. Ён можа прыйсьці толькі ад шырокіх працоўных масаў усяе Эўропы цалком, на плечы якіх крывавая хваля пагражае зваліцца ўсім сваім цяжарам.

Палітычныя падзеі.

Лазанская канфэрэнцыя, як і ўсе папярэднія, спаўзла на нічым. Прычынай зрыву канфэрэнцыі зьяўляецца спорка паміж Англіяй і Турцыяй за Масульскі акруг, вельмі багаты ў крыніцы газы і цераз які праходзіць Багдадская жал. дар. Прыймаючы пад увагу вялікае эканамічнае значэньне гэтага акругу Ан[і]я, маючы на мэці шырокую экспл'ёатацыю багацьцяў гэтага краю, ні за якую цану ня хоча згадзіцца на далучэньне яго да Турцыі. Насяленьне Масульскага акругу ў большасьці курды, ў якіх за апошні час хаця і слаба прабуджаецца нацыянальная сьвядомасьць, і англічане ў часе свае акупацыі ўвялі ў школах выклады на курдскай мове, а гэта для туркаў непажадана, бо падняцьце нацыянальнай сьвядомасьці курдаў павяло—б за сабою да аканчальнага абасабленьня турэцкага Курдыстану.

Ангелійскі міністар заграцічных спраў хоча перадаць вырашэньне гэтай справы Лізе народаў, але туркі зусім на гэга не згаджаюцца і магчыма, што дойдзе да аружнага змаганьня. Ужо туркі нарыхтавалі дывізію проці Масулу, а грэкі трымаюць пад Марыцай 60—70 тыс. войска.

Францыя, як і іншыя саюзьнікі, да гэтага часу не падтрымлівалі дамаганьняў Англіі датычна Массулу і гэта можа зьмяніць становішча Англіі адносна да акупацыі француза[ў] Рурскага басэйну, ў якім пытаньні [Анг]лія дагэтуль трымалась нэйтральна.

У Рурскім бас[эйне] [illegible] занятым французамі з мэтай [illegible] [выц]арыстаць багацьці гэтага краю, каб [illegible]рыць свае ваенныя страты, французам ніяк ня ўдаецца выпаўніць свае замеры, дзякуючы арганізаванаму спраціву нямецкага грамадзянства. У адказ на рэпрэсіі і арышты заба ставалі жалезнадарожнікі, і французы ня маюць магчымасьці вывозіць вугаль у Францыю. Аб'яўлена асаднае палажэньне. Акупацыя пагражае аканчальнаму зруйнаваньню нямецкай прамысловасьці. Курс маркі страшна панізіўся. Нямецкі ўрад выдаў загад, каб ніхто не выпаўняў загадаў акупацыйных уладаў.

Італія. Урад Мусcоліні стараецца ўселякімі способамі ўмацаваць сваю ўладу. Нідзе яшчэ ўрад ня быў на столькі вузка—партыйным, як ўрад Мусоліні: ўся міліцыя састаіць выключна з фашыстаў, адміністрацыйны апарат абсаджываецца толькі фашыстамі. Абвешчаная амнэстыя застасавана толькі да фашыстаў. Праэктуецца зьмена канстытуцыі і выбарнага права, каб забясьпечыць у будучым парлямэнце абсалютную большасьць фашыстам і стварыць абсолютны ўрад. Навет кароль адсовываецца ад уплываў на палітыку. Лік безработных правышае паўмільёна.

Англія. Прамысловы крызыс у Англіі, вынікам якога лік безработных павялічыўся 1.300.000, надта дрэнна адбіўся на работніцкім руху. Касы прафэсыянальных саюзаў апусьцелі і з гэтай прычыны няма магчымасьці вясьці моцнае змаганьне за паляпшэньне работніцкага быту.

Польшча. Дарагавізна ў Польшчы расьце з кожным днём. Цэны на некатарыя тавары падняліся больш, як на 100 проц. Назначаны надзвычайны камісар па барацьбе з дарагавізнай Гартлеб (P. P. S.)

Забойца прэз. Нарутовіча — Невядомскі не атрымаў уласкавеньня і 31-га студня разстраляны.

Сойм большасьцю 143 галасоў проці 130 пастанавіў звольніць з вастрогу пасла камуністаў Крулікоўскага, які засуджаны быў на 3 спаловай гады цяжкага вастрогу.

24-га студня адбылася нарада з Старшынёй Міністраў п. Сікорскім на чале ў справе аздараўленьня стасункаў на т. зв. „Kresach Wschodnich“. Між іншым была парушана справа асадніцтва.

Літва. Літоўскі Сойм прыняў пастанову аб далучэньні Клайпэды да Літвы на падставе шырокай аўтаноміі.

Клайпэдзкія паўстанцы адмовіліся на жаданьне міжсаюзнай камісіі разаружыцца.

У Югаславіі рыхтуюцца да выбараў у новы Сойм. У старым Сойм

вадзілі рэй радыкалы—прыхільнікі цантралізацыі. Харвацкая рэспубліканская сялянская партыя, якая стаіць на грунце стварэньня незалежнай Харвацкай сялянскай рэспублікі і меўшая ў старым Сойме 53 паслоў—у знак пратэсту проці палітыкі сучаснага Ураду — удзелу у соймавай працы ня брала. Камуністы, меўшыя 50 мандатаў, былі асобнай соймавай пастановай выключаны з Сойму.

Сяўцы цемры.

Праца польскіх школьных інспэктароў вядзецца ў нас у такім кірунку, што можна надумаць, быццам яны зусім сьвядома працуюць дзеля шырэньня не прасьветы, а цемры сярод беларусаў, ці што самі яны перакананы, што гэтым прыносяць карысьць Польскай Рэчыпаспалітай.

Каб ня быць галаслоўнымі, мы разгледзім рад бязспорных фактаў. Датыкаюцца яны дзейнасьці пераважна валожынскага школьнага інспэктара, але характэрны блізка для ўсіх „сяўцоў прасьветы на крэсах".

Валожынскі школьны інспэктар, пан Мечыслаў Страчынскі, які прыехаў рабіць на Беларускай зямлі „польскую справу" ажно з Галічыны, вядзе работу ў двух напрамках. З аднага боку ён стараецца адчыняць чым-больш польскіх школ у беларускіх вёсках, з другога—недапускаць істнаваньня беларускіх школ. Зусім паводле сыстэмы маскоўскіх царскіх жандароў: „ташчыць" і „не пушчаць"! Алеж гвалтам у польскую школу беларускіх дзяцей не „заташчыш". У рэзультаце—ў Валожыншчыне (як і шмат дзе па другіх паветах) польскія школы істнуюць пераважна на паперы, бо народ зусім ня хоча пасылаць туды сваіх дзяцей, а жадае школы ў роднай беларускай мове. А тымчасам грошы на гэныя пустуючыя школы йдуць, польскі скарб выплачывая пэнсіі вучыцялём, якія нічога ня робяць, сідзючы ў пустой школе. І грошы не малыя — тысяч каля сотні польскіх марак! Хоць малая ім цана, але-ж ідуць яны ўсё з народнай кішані на глум і марнатраўства. Гэтак у вёсцы Гародзкі, Забрэзкае гміны, ужо некалькі месяцаў сядзяць ажно д з ь в е польскія „навучыцелькі", а ў іх школу сьпярша хадзіла ажно... п я ц ь дзяцей, цяпер-жа—н я м а н і в о д н а г а! А дзе, пане інспэктару, установленая норма для школ, якія утрымлівае урад? І так робіцца шмат дзе па другіх вёсках...

Затое, калі беларускі народ імкнецца горача да роднай беларускай школы, пан валожынскі інспэктар проста „ня пушчае" — ўсё паводле таго-ж старога маскоўска жандарскага спосабу. У тых-жа Гародзьках была адчынілася беларуская школа. Дзеці, ахвочыя да вучэньня, грамадой кінуліся у с в а ю школу. Сабралося каля 70 вучняў. І што-ж? Пан інспэктар адмовіўся зацьвярдзіць гэту школу, аб'явіў яе нелегальнай і разагнаў праз паліцыю...

І так зроблена шмат у якіх вёсках, дзе беларускія школы тварыліся самым народам — згодна з яго воляй і навет згодна з асноўнымі законамі Польскай Рэчыпаспалітай. Воля народу і закон— гэта пана інспэктара зусім ня цікавіць. Вось факты, якія пацьвярджаюць нашы словы.

У лістападзе месяцу 1922 году вучыцель-беларус, Міхась Ануфрэявы Станкевіч, з в. Гародзькі, падаваў усё таму-ж валожынскаму інспэктару заяву аднасяльчан аб адчыненьні беларускай школы. Інспэктар упіраўся. Тады вучыцель пачаў даводзіць, што беларусы маюць права на школу ў роднай мове навет паводле польскае Канстытуцыі, на аснове § 110 яе. Дык што-ж? Пан інспэктар, не надумываючыся доўга, проста адрэзаў: „Przecież Konstytucja ta nie jest jeszcze zatwierdzona!"

Заява гэткага роду аб прынятай Устаноўчым Соймам Канстытуцыі ў другой дзяржаве завяла-бы ўрадовага служачага проста на лаву падсудных. А ў нас—пан Мечыслав Страчынскі на тое толькі і прысланы да нас з Галічыны, каб „ташчыць" і „не пушчаць", дык яму можна ўсё: абы толькі дайшоў сваей мэты, абы толькі недапусьціў да асьветы беларускіх дзяцей у роднай мове...

Вось яшчэ факт, каторы мы толькі ня хочам называць тым іменьнем, на якое ён заслугуе. Сяляне вёскі Гарадэчна, таго-ж Валожынскага павету, Забрэзскае воласьці, падалі просьбу аб пазваленьне адчыніць беларускую школу. На гэта пан інспэктар адказаў, што школа можа быць адчынена, паміж іншым, калі будзе зроблена адпаведная пастанова гміннае рады (папера № 2193 з 28. XII. 1922). Вось-жа 24 I 1923 гмінная рада Забрэзскае гміны зрабіла гэткую пастанову: „Rozpatrzywszy uchwałę wsi Zaprudzie Wielkie o otwarciu u nich szkoły białoruskiej Rada Gminna większością głosów u c h w a ł ę t ą p o p i e r a. Rada Gminna popiera i te 6 uchwał, które przez urząd gminy przesłane do inspektora szkolnego przy piśmie z dnia 21.X.r.b. L. 2223, a mianowicie ze wsi Datnowa Wielka, Horodźki, Horodeczno, Koszczolicze, Listopady, Hankowicze".

І што ж? Думаеце, што пан валожынскі інспэктар падаўся?—Ды ніколі! Ён цьвёрда стаіць на сваім: каб паказаць начальству, што ў яго павеце ёсьць выключна польскія (хоць толькі на паперы) школы, і вось ён і гэту пастанову гміннае рады адкінуў. Чаму? Бо, бачыце, там напісана: «uchwałę popiera», а не „uchwala"...

Начальства хіба ацэніць «спрыт» пана інспэктара. Мо' ацэніць яго і генарал Сікорскі, які абяцаўся ў Сойме „пачысьціць" наш край ад панкоў — «Kacyków», што робяць падобную процізаконную работу. Будзем спадзявацца... А тымчасам у беларусаў школ ніякіх няма, дзеці ня вучацца, і цемра пашырае з кожным днём панаваньне на нашай зямлі...

Лаўрыновіч.

Калі беларускі селянін дачаке зямлі.

Польская зямельная рэформа кажа: ў прынцыпі ніхто ня мае права мець больш як 180 гэктараў (164 дзесяціны) зямлі. Уся зямля дзеліцца на 11 катэгорый; у першую катэгорыю уваходзяць усе быўшыя царскія землі і належучыя да расейскага скарбу. Пасьля ідуць усялякія царкоўныя, манастырскія і т. п. землі (калі на гэта будзе згода Ватыкана,—папежа). На апошнім месцы стаяць землі вялікіх абшарнікаў, з якіх у першую чаргу з самымі заняпаўшымі гаспадаркамі. За ўсю зямлю, апрача першых дзьвух катэгорыі, дзяржава выплачывае ў высаце даваеннай вартасьці. Апрача гэтага, прыватным уласьнікам даецца магчымасьць дабравольнай распрадажы зямлі, калі да іх падойдзе чарга.

Гэтак выглядае на паперы, а ў жыцьці яшчэ горш. Паны абшарнікі, ў чыіх руках і суд і расправа, не даюць дыхнуць селяніну; даходзіць да таго, што штрафуюць сялян, калі якое канянё узойдзе на дзярван, а дзерваноў дзесяткі тысяч дзесянцін ляжыць аблогам, бо паны не спраўляюцца абрабляць, у той час па вёсках малазямельнікі гібеюць на вузенькіх шнурочках.

Праўда ёсьць выпадкі, калі дзеляць і маёнткі, але гэтыя выпадкі бываюць толькі ў нас на беларускіх абшарах. Маёнткамі гэтымі надзяляюць здэмабілізаваных жаўнераў польскай арміі (асадніцтва). Гэтым жаўнерам, у час вайны, была абецана зямля і вось, каб іх супакоіць і трымаць у руках беларускія працоўныя масы, ім далі беларускія землі і ўсе прывілегіі, належучыя палякам на Kresach Wschodnich.

Вось тут і родзіцца пытаньне: як жа будзе? хто нам дасьць зямлю? Бо трудна нам жыць зруйнаваным вайной, пры нізкай сельска-гаспадарчай культуры, у страшэннай цеснаце (45 працэнтаў ворнай зямлі знаходзіцца ў руках паноў абшарнікаў).

Можа Вызваленьне дасьць зямлю, бо аб іншых польскіх партыях дык няма чаго казаць. Недачаканьне. Больш кот наплача, як Вызваленьне дасьць зямлі.

Гэтае самае Вызваленьне на кангрэсе ўсей партыі ў 1921 г. галасавала за тую вышэйпісаную зямельную рэформу, каб сяляне выкупалі зямлю, каб пытацца ў папежа ці можна дзяліць манастырскія землі (зразумела, што не дазволіць), каб паны мелі права прадаваць свае землі за доляры, каб насаджываць тут польскіх каляністаў.

Дык можа, Беларускі Пасольскі Клюб чаго дабецца? Толькі ён адзін дамагаецца зямлі без выкупу, хто на ёй працуе. Можа што калі і зробіць, а тым часам справа дрэнь, бо калі якое паляпшэньне і удасца вырваць, дык пакуль яно дойдзе да народа, дык так перакруціцца, абскубецца, што і карысьці з яго будзе, як сьляпому з акуляраў. Ведама, паны ўсюды верхаводзяць і робяць на сваю карысьць. Аднэй рукой даюць, а другой адбіраюць.

А спрабуйце іх угаварыць пайсьці на ўступкі, адмовіцца ад ласых дзядоўскіх абшараў.

Гісторыя яшчэ не знае такога прыкладу, каб якая кольвеча кляса адмовілася ад сваіх прывілегіяў, а калі дабравольна адмоўляецца значыць робіць на гэтым цёплы інтэрас.

Р. Юргілевіч.

З Савецкай Беларусі.

Бярэзінскі водны шлях.

К ліку пытаньняў, якія павінна вырашыць у бліжэйшы час Эканамічная Нарада Беларусі, адносіцца і пытаньне аб адраджэньні Бярэзінскага воднага шляху. Гэты шлях, які складаецца з каналаў, рэк, вазёр, злучае раку Бярэзіну з Заходняю Дзьвіною і ў ранейшы час меў значнасьць дзеля сплаву лясных матар'ялаў па Дзьвіне ў Рыгу. У сучасны момант, з прычыны запушчанасьці, гэты шлях ня можа мець вялікай значнасьці, тым больш, што сплаў па Дзьвіне амаль ня робіцца. Адпак, прымаючы пад увагу, што ў бліжэйшай будучыне сувязь з Рыгаю будзе налажана і што басэйн Бярэзіны мае значныя лясныя багацьці, Эканамічная Нарада Беларусі рашыла абсьледаваць, супольна з Вітабскаю Губэрскаю Эканамічнаю Нарадаю, пытаньне аб адраджэньні ўсяго Бярэзінскага воднага шляху.

М. В.

З Менску.

З-га студня ўвечары ў клюбе Карла Маркса адбыўся вечар беларускай рэвалюцыйнай паэзіі, дзе разглядаліся творы беларускай часопісі „Полымя".

„Полымя" пачынае выходзіць у сьвет толькі на шостым годзе жыцьця Савецкае ўлады наогул і чатырох гадоў яе істнаваньня ў Беларусі.

Першым беларускім рэвалюцыйным журналам зацікавіліся ня толькі беларуская інтэлігэнцыя, але большая частка менскіх маладых літэратараў і культурна-палітычных дзеячаў.

Першы выступіў з дакладам Ігнатоўскі, які даў кароткі нарыс разьвіцьця сьвядома беларускай думкі за ўвесь мінулы век да першай эпохі адраджэньня ў 1905 г, і пасьля гэтага да сучаснага моманту—да выхаду першага беларускага марксыцкага журналу.

Дакладчык падробна застанавіўся над самым тэрмінам „адраджэньне".

„Для нас нацыянальнае пытаньне ёсьць пытаньне культуры. Наша праца ў галіне нацыянальнага адраджэньня поўнасьцю зьмяшчаецца ў рамкі культурнага будаўніцтва".

Пасьля гэткіх уводзінаў Ігнатоўскі зачытаў праграмны артыкул часопісі. Гэты сьціслы артыкул дакладчык чытаў з шырокімі тлумачэньнямі, што выйшла вельмі цікава для тых, хто ня быў зусім знаём з беларускім рухам.

Суліма.

Што такое „Wyzwolenie" з беларускага пункту гледжаньня.

Хітрае прыкіданьне, кажа пагаворка, ёсьць тая дань паважаньня, якую вада аддаець дабрачыннасьці,—на якую вада толькі і здатна...

Гэтак—у маралі.

У палітыцы прыкіданьне ў словах і тактыка зьяўляюцца тэй першай даняй, якой накідаецца на сваіх яўных і скрытых ворагаў новае зьявішча, якое робіцца палітычнай моцай...

Усе падробнасьці і дозы гэтага прыкіданьня ў адносінах да беларусаў, у час выбараў з боку польскіх партый тлумачацца безумоўным прызнаньнем моцы і значэньня беларускага народу, як новага палітычнага факта, з якім хочаш-ня-хочаш, а мусіш лічыцца...хоць бы ў сваіх інтарэсах.

Гэты ўласны інтэрас лепш за ўсіх зразумелі вызваленцы.

„Вызваленьне шчыра шануе ўсе народныя скарбы мужыцкай душы... дамагаецца права кожнага народу свабоднага разьвіцьця і паставаньня сваей мовы ў школе і т. д." Гэтак гаворыцца ў беларускай прадмове. Але-ж у самай праграме, ў аддзеле „Школьная справа", гэтая дэкларацыя зусім не апрацавана, не пашырана, нават зусім не ўспомнута.

Можна падумаць, што школьнае пытаньне для Беларусі цалком вырашаецца ўжо тым, што «Wyzwoleniem" даецца Тэрыторыяльная Аўтаномія Беларусі.

Аднак, не зважаючы на гэта, мы павінны прызнаць беларускі фабрыкат Wyzwalenia паддзелкай. Самай лепшай, як было ўжо сказана з усіх зробленых у Польшчы, але ўсёткі паддзелка.

Перш-на-перш Wyzwolenie, пры ўсіх сваіх заслугах, ёсьць паддзелкай дзеля таго, што побач з ім з мамэнту аб'яўленьня выбараў на свабодным народным рынку зьявіўся здаровы натуральны прадукт, які да гэтага часу акупацыйным кардонам не дапускаўся на гэты рынак...

Само Wyzwolenie не называець сябе беларускай партыяй, але польскай. З праграмы Беларускага Адраджэньня Wyzwolenie дзеля таго і бярэць толькі тое, што ў інтарэсах Польшчы, і застанаўліваецца там, дзе інтарэсы Польшчы і Беларусі пачынаюць разбегацца... адкуль праўдзівыя ідэалёгі беларускага народу толькі пачынаюць другую палавіну шляху...

Вось чаму партыя, якая прыймае так блізка да сэрца інтарэсы, радасьці і гора, „шануючая скарбы" беларускага народу, не пачула найменшых болі ад крывавага падзелу на часьці жывога цела Беларусі, не пратэставала супроць праступнага, дзікага, з беларускага пункту гледжаньня, Рыскага міру.

Вось чаму партыя Wyzwolenie ня толькі спакойна дазваляе, але і ўпарта падтрымовывае палітыку асадніцтва, якая шкодная ня толькі соцыяльна-эканамічна, але і нацыянальна раскладаючая Беларусь гэта ваенная калянізацыя, маючая на мэце апроч „умацаваньня усходніх граніц(?!)" апроч „павышэньня сельска-гаспадарскай культуры(!?)", яшчэ, падобна свайму усходня-прускаму арыгіналу, і дэнацыяналізацыю края. Вось чаму Wyzwolenie альбо маўчыць, альбо ўхілаецца «занясеньнем у пратакол" мімаходам пададзеныя пратэсты, тады калі польская ўлада душыць беларускую школу, прасьледуець беларускія ўстановы, садзіць у вастрог альбо высылаець без суда і следзтва беларускіх грамадзкіх і палітычных дзеячоў. І зразумела, бо гэткая палітыка была як найлепш выгадна для партыі Wyzwolenia: яна ачышчала вызваленцу поле дзейнасьці на беларускіх абшарах ад самага страшнага, адзінага канкурэнта яе сапраўднага беларускага палітыка і разам з гэтым для партыі, якая востра крытыкуе уладу ствараўся арэол і вядомыя сымпатыі селяніна.

Вось чаму партыя Wyzwolenie, пры ўсім сваім „пацунку да скарбу беларускай душы" змушана сама атразаць крыльля беларускаму нацыянальнаму руху, загадзя спыняць усе яго нямінучыя намеры падняцца лішня высака, падняцца вышэй назначанай праз Wyzwolenie лінію, пераляцець межы Польшчы... Вось чаму Wyzwolenie ня можа і ня хоча зьвяршыць беларускую сьвятыню „скарбаў народнай душы" купалам дзяржаўнай незалежнасьці. Можа гэты ідэал цяпер трудна зьдзяйсьнімы, можа гэты купал яшчэ воблачна-высокі, але-ж усе вочы і дух беларускага народу сквапна зьвернуты туды, на неба!..

І так бязумоўна, што Wyzwolenie толькі па ліку розніцца з іншымі польскімі партыямі, якайсьцяй сваей цалком належыць да іх.

Wyzwolenie ёсьць самай лепшай і хітрай соцыяльнай і нацыянальнай паддзелкай і гэтым тлумачыцца яе цяперашняя часовая моц і натуральнасьць на нашым занехаеным падбітым народным рынку. Але хай паявіцца здаровы сапраўдны прадукт беларускай ідэалегіі, як усякая фальсыфіката зчэзне, як шкодная непатрэбшчына, бо ня будзе мець спажыўца.

Такая як пабачым, немінучая судзьбіна чакае Wyzwolenie.

Потым чытаў свой твор „Гвалт над формай“ беларускі пясьняр Міхалка Грамыка.

Паэт Цішка Гартны выступіў з крытыкай вершаў М. Чарота „Зімою“, „Плывём к прыгожа-сьветлай далі“ і паэмы М. Грамыкі „Гвалт над формай“.

Ц. Гартны строга скрытыкаваў, як творы Чарота, таксама і Грамыкі. Ц. Гартны—прыхільнік старых формаў у паэзіі і канкрэтнага, яснага рэвалюцыйнага зьместу. Побач з гэтым т. Гартны гаварыў і аб паэме Чарота „Босыя на вогнішчы“. Ен даказваў, што ў паэме нічога пралетарскага няма, што босыя зьяўляюцца толькі люмпэн-пралетарыятам, якія нічога ня твораць у рэвалюцыі, а толькі руйнуюць.

„Гвалт над формай“ зьяўляецца па зьместу творам ні для кога незразумелым і карміць пралетарыят такімі творамі нельга. Кволыя вобразы дробных вершаў Чарота—пралетарыяту чужды, настрої ў іх—ёсьць спадчына буржуазьніцкай ідэалёгіі.

Пасьля крытыкі Ц. Гартнага пачаліся гарачыя спрэчкі; выказваўся цэлы шэраг пісьменьнікаў і культурных дзеячоў: т. т. Лёсік, Баліцкі, Вайнэр, Дыла, Смоліч, малады паэт Розенблюм, Чаржынскі, Шукевіч-Трацьцякоў і іншыя.

Пытаньні былі вось якія: заданьні пралетарскага мастацтва, шуканьне новых формаў у паэзіі, зьмест і форма вершаў.

Адразу разьдзяліліся на два лягеры: т. т. Жылуновіч, Лёсік і Смоліч выказаліся галоўным чынам за канкрэтны рэвалюцыйны зьмест; не зьвяртаючы вялікай увагі на форму, карыстацца вядомымі формамі клясыкаў. Разумеецца, кожны з іх выказаў свае думкі па свойму, з свайго пагляду.

Жылуновіч прытрымліваецца рэалізму і рамантызму ў паэзіі ў стылю рэвалюцыйнай паэзіі расейскага паэта Мельшына.

Лёсік шукае ў новай паэзіі канкрэтнай карысьці для шырокіх пралетарскіх масаў.

Смоліч кажа, што беларуская пясьнярка Цётка яшчэ ў 1905 годзе пісала рэвалюцыйныя вершы, якія і па сягонешні дзень адпавядаюць свайму назначэньню.

Т. т. Баліцкі, Вайнэр, Дыла, Чаржынскі, Розэнблюм, Шукевіч-Трацьцякоў і інш. выказаліся за шуканьне новых формаў у паэзіі і разумеецца з адпаведным рэвалюцыйным зьместам. — Гэта другі лягэр, які з рознымі адценкамі, кожны па свойму выказаў прыхіл да хараства, да музыкальнасьці і да вялікага (хоць-бы і буржуазнага) мастацтва ў новай рэвалюцыйнай паэзіі.

Паэт ня можа пісаць пад пэўную дыктоўку, па пэўнай праграме. Ен піша свае перажываньні так, як яму дыктуе сваё пачуцьцё, свая ўласная фантазыя.

Пралетарская паэзія—гэта ня толькі фабрычны варштат, гуд машынаў, шорхі сахі і г. д. Гэта вельмі вузкі гарызонт для паэзіі. Пралетарская паэзія абхоплівае ўсялякія сужэты, толькі глядзіць на іх праз сваю прызму.

Прадстаўнікі Цэнтральнага Статыстычнага Бюро М. І. Шкубэр і І. Я. Гэрцык зрабілі на паседжаньні Гарадзкога Выканаўчага Камітэту даклады аб выніках статыстычнага перапісу па м. Менску.

Перапіс рабіўся па полу, узросту, сямейнаму становішчу, нацыянальнасьці, прафэсіі і пісьменнасьці.

Вынікі перапісу насельнасьці ў 1922 годзе лічылася 102.375 (мужчын—48.476 кабет—53.899), У 1897 г. усяго насельнасьці ў Менску лічылася 97.000 чалавек.

Па нацыянальнасьці: беларусаў. лічыцца—34 проц. (у 1897 г.—9 проц.), вялікарусаў—9 проц. (у 1897 г.—25 п.), палякаў—5 з паловай проц. (у 1897 г.—11 з паловай проц.), жыдоў — 47 проц. (у 1897 г.—51 проц.), 4 з паловай проц. кладзецца на іншыя нацыянальнасьці: літоўцаў, латышоў, украінцаў, татар, немцаў і інш.

Беларусаў у Менску 35.052 чал., вялікарусаў—8.864 ч., палякаў—5.724 ч. жыдоў—48.379 ч.

Ц. В. К. і Нар. Кам. Унутр. Спраў Беларусі зацьвердзілі новую форму са спэцыяльнымі адзнакамі для міліцыі Беларусі.

* * *

Як ўсё ў жыцьці—яшчэ вясна
Мінула ў вечнасьць на заўсёды
І сьлёз балей няма й прыгодаў.
Як ўсе ў жыцьці—яшчэ вясна...
Душа-ж баліць—ёй сумна, шкода,
А думка за аднэй адна:—
У тваім жыцьці яшчэ вясна
Мінула ў вечнасьць на заўсёды.

Ул. Ж.

Мова пасла Б. Тарашкевіча.

Маршалак: Слова мае пасол Тарашкевіч. (Каля палавіны паслоў пасьля перарыву йшчэ не вярнулася з буфэту).

п. Тарашкевіч: Высокая, але... пустая Палата! (голас з цэнтру: запоўніцца!)

Супроць зводным рахункам нашых ворагаў, супроць іхным усялякім аблічэньням, часамі дужа вучоным, і над усякае спадзяваньне навет нашых нямногіх прыяцеляў,—мы пераступілі парогі Сэйму Польскай Рэчыпаспалітай.

Пераступілі мы гэтыя парогі ў колькасьці па праўдзе неадпаведнай да масы беларускага народу, які мы маем права прадстаўляць, але у колькасьці дастатачнай на тое, каб ня толькі перад Польшчай, але перад цэлым сьветам даць доказ таму, што жыве беларускі народ. (воплескі на беларускіх лавах).

(Заля памалу запаўняецца).

Пытаўся нас пасол Корфанты аб нашым гістарычным пашпарце; ці мы маем права на жыцьцё, ці мы народ. Калі пан Корфанты ў Прускім Сойме змагаўся за свабоду польскага народу, уся нашая сымпатыя была на ягонай старане. Калі пан Корфанты на Горным Шлёнзку быў правадыром вызваленьня польскага народу, які да Польшчы блізка што ніколі не належыў, які затраціўшы быў блізка што зусім сваю нацыянальнасьць і сваю сьведамасьць, але адрадзіўся і пачаў еднасьць з усім польскім народам, — сымпатыі нашыя былі мо, не на старане мэтацаў пана Корфантага, але-ж на старане польскага народу. І сёньня гэты самы Корфанты, ад якога можна было б спадзявацца, што ён, так доўга змагаўшыся за свабоду свайго народу, ушануе такое-ж імкненьне другога народу да свабоды, гэты сам Корфанты хоча нас выразна полёнізаваць. Пан Корфанты—каталік, пан Корфанты—хрысьціянін! Добрае каталіцтва, добрае хрысьціянства... Вось запраўдная этыка гіены (крыкі готэнтоты!): блага калі мяне мой сусед цісьне, але добра калі я цісну суседа. (Голас: Корфанты гэта не казаў). Але у сваей палітыцы гэта праводзіць. Толькі-ж перафразуючы беларускую пагаворку скажу: Калі Бог не пазволіць, то... гіена ня зьесьць. (Воплескі на левых лаўках). А ня зьесьць гіена затым, што гіена корміцца трупамі. (Воклескі на левых лавах). Народ-жа наш жывы арганізм і, як жывы арганізм, як зборны чалавек, здоляе перамагчы хоць-бы сабе найдзічэйшую бэстыю. (На левай: браво!). Вы пытаецеся нас аб пашпортах, але лепш было-б, каб такое пытаньне задаўбы нехта, хто больш знаецца на гэтай справе, як пан Карфанты. Ня крытыкуючы яго павагі ў другіх пытаньнях, скажу, што у даным разе ён бярэцца за дзела, аб якім ня мае ніякага паняцьця.

Беларускі народ ня цяпер толькі нанова творыцца. Беларускі народ — народ стары, але разам з тым і малады, малады таму, што адраджаецца і уступае ў сямью жывых, змагаючыхся за сваё жыцьцё народаў. Гэта народ, які меў вялікую культуру, народ, якога мова была мовай гаспадарсьцьвеннай, які меў сваю гаспадарсьцьвеннасьць. Гэта ёсьць народ, у мове якога былі пісаны законы. Так Статут Літоўскі, хоць называўся літоўскім, але быў напісаны пабеларуску, — і ў гэтым статуце права мовы беларускай было забясьпечана: „а пісар земскі мае ўсе выпісы і позвы языком і літэры рускімі, а не іншымі пісаці“.

(Галасы: Рускі, а не беларускі!) І не белапольскі, але мова ёсьць тая самая. Гэта ёсьць народ, які перажыў вялікі век адраджэньня, які толькі дзеля таго, што ў барацьбе з захватамі з усходу і заходу стаў разам з Польшчаю — страціў сваё прывілегіраванае становішча, становішча асабліва і ў той час высока-культурнае. Шляхта наша, ў пагоні за шляхоцкімі свабодамі і гэрбамі, здрадзіла свой народ, а затым прыняла польскую культуру. Але пад уплывам барацьбы Расеі з Польшчай аб душу беларускага народу зьніклі, памёрлі толькі вышэйшыя клясы, народ жа беларускі як праваслаўны, так і каталіцкі жыў і жыве сваім жыцьцём. І калі настаў XIX век, век дэмакратычны, век нацыянальнага адраджэньня, стаў прабуджацца і сьвядомы беларускі рух. Адрадзілася Чэхія і гэта ёсьць яркім прыкладам таго, што народ, які часова заснуў, не памёр і можа прабудзіцца да новага жыцьця і часта можа быць прыкладам для другіх народаў.

(канец будзе.)

Аб нашых лясох.

Ратуйце лясы!

З усіх кутвоў Заходняе Беларусі даходзяць балючыя чуткі аб ніштажэньні лясоў. Без усякай сыстэмы, без дазволу і з дазволамі улады, пад тапаром спэкулянтаў покатам кладуцца нашыя векавечныя лясы — краса і багацьце краю. Рубяцца ў шчэнт розныя гатункі дрэў, няма ашчаднасьці і да маладога лесу, якога больш марнуецца, як тэй карысьці. Няма тэй дарогі, па якой бы не вывозіліся тоўшчазарэныя круглякі, стромкія шасьцёркі. Няма таго дня, каб сотні тысяч гэтых ахвяр пустадомкаў не пакідалі мяжы сваей Бацькаўшчыны. Мільярды народнага багацьця пападаюць у рукі спэкулянтам. Вялікія абшары ўжо агалочаны ад лесу. Праежджаеш дзесяткі вёрст і ня сустрэніш ні аднаго дрэўца. Адны карчы і пасекі. А праз некулькі гадоў наш бедны грунт абернiцца ў пясок і пустыню.

У гэты самы час сялянства мерзьніць у нятопленых хатах, гібея па сырых зямлянках. Шмат лягчэй купіць тысячу штук дрэў, чымся неякага поўсажня дроў, бо купец ня хоча пэцкацца з драбязой ды і часу ня мае на глупства. Дзікі шал нажывы, трывожная сьпешка ахапіла спэкулянтаў. Плацяць аграмадныя грошы за вываз дрэва, праводзяць чугункі, сотні тысяч марак лятуць на подкупы, на „падмазкі“. Усе станцыі завалены, рэкі запруджаны, па шляхох валяюцца бярвеньні.

А мясцовая адміністрацыя так як і ня бача—для іх закон ня пісаны.

Горкая доля гэтых няшчасных Kresów,—праходзілі па іх агнём і мячом, а цяпер праходзяць з тапаром.

Што паны, чуючы свой недалёкі канец, ачумеўшы хапаюцца награбіць—прызапасіць на чорную гадзіну, што ім, недалюдкам, зусім не абходзіць, што руйнуецца дабрабыт краю — пасьля іх, хоць патоп, дык тут няма дзіва. Але што дзяржава на гэта дазваляе, глядзіць на нас як на пакананых, і вядзе тымчасовую нясумленную гаспадарку, дык тут ёсьць над чым падумаць і зрабіць свае вывады.

Ясна адно, што калі мы самі сябе не паратуем, дык ніхто нас не паратуе. Будзем-жа мы ратаваць лясы, як хто можа і ўмея, пашкадуем самі сябе, бо наш край без лясоў галодную сьмерць нам суліць. Калісь лясы баранілі нас ад нападаў дзікіх ворагаў, цяпер мы павінны абараніць іх ад яшчэ горшых дзікароў, напаўшых на лясы.

Ю. Р.

Лясы галоцяць.

У нашай Юрацішскай гміне, Валожынскага павету лясы рубяць з дазволу і без дазволу. У абшарніка Радкевіча, у яго двары Юрацішках выраблена без дазволу больш 100.000 пнеў будаўлянага лесу. Аб гэтым даведалася месцовая ўлада, быў састаўлены пратакол усяго толькі за выруб‌леных 50 пнеў і наложаны штраф 500.000 мар. Гэткія грошы цяпер бяруцца за адну сажань дроў. Усе лясы, якія тут вырубаюцца ў шчэнт, вывозяцца заграніцу.

А тым часам бежанцам, якія жывуць у зямлянках, яшчэ перад галасаваньнем у Сойм староста, каб звабіць больш галасоў, абяцаў выдаць сухастоіны. Але гэта так абяцанкай і асталося, а міма ашуканых сялян гоняць безупынна векавечныя нашыя лясы ў далёкую чужыну.

К. Св.

Анкета

па пытаньню аб ніш[illegible]ньні лясоў.

1. Павет, воласьць.
2. Колькі усяго дзес[illegible] су было ў воласьці да 1919 г[illegible] „казеннага“; б) панскаг[illegible] іншага; колькі разам?
3. Колькі дзесяцін (або гэктараў лесу высечана за час ад 1919 году: а) „казеннага“, б) панскага, в) царкоўнага, касьцельнага, сялянскага іншага?
4. Ці не было якіх—небудзь надужыцьцяў пры прадажы лесу, прыкладам—прадажы без усякага дазволу, або прадажы большага ліку дзесяцін, як было дазволена?
5. Каму прададзены лес: а) тутэйшым сялянам для іх патрэбаў, б) лясным спэкулянтам, в) заграніцу, г) на патрэбу чугункі, д) на іншыя якія мэты?
6. Ці адпускаецца уладай лес мясцоваму сялянству на іхныя патрэбы і на якіх варунках?
7. Ці праходзіць праз воласьць чугунка, а калі не, дык у колькіх вярстох ідзе чугунка?

Беларускі Соймавы Клюб.

Мае думкі.

Беларуская школьная справа ёсьць самая балючая справа сяняшняго дня. Адпаведнага выражэньня яе, згоднага з пажаданьнем беларускае людnасьці, чакаюць дзясяткі тысяч беларускіх дзетак. Дзеля гэтага кожная новая вестка ў школьнай сараве спатыкаецца людnасьцю нашай з напружаннай увагай. Беларуская Цэнтральная Школьная Рада, якая ў працягу усяго 1922 году ніяк не магла, дзякуючы перашкодам з боку школьных уладаў, нарыхтаваць як належыць школьнай беларускай справы, не магла на пісьме дастаць ад ўладаў на правінцыі правілаў і інструкцыяў, пры спаўненьні якіх магчыма было-б адчыніць хоць прыватную школу беларускую ў вёсцы, ўрэшці дастала 21.1.23 г. ад Куратара Віленскага Школьнага Акругу „Інструкцыю аб спосабе закладаньня прыватных пачатковых школ,“ № 729 якая ўваходзіць ў жыцьцё з 1 лютага гэтага году, як зазначана ў паперы ад Куратара.

Разгледзім-жа гэтую „Інструкцыю“, якая ў дакладным перакладзе з польскае мовы мае гэткі поўны выгляд..

§ 1. Таварыствы, статут якіх прадугледжавае права на закладаньне прыватных школ, як роўна і паасобныя людзі, могуць адчыняць прыватныя пачатковыя школы па набыцьці канцэсіі на гэта ад Куратара Школьнага Акругу.

§ 2. Заявы аб канцэсіі, складаныя на рукі Школьнага Інспэктара, павінны паказываць: а) месца і дакладны адрэс школы; в) імя, прозьвішча і адрэс кіраўніка школы; с) праэкт праграмы, плян навукі і выкладовая мова ў школе; d) бюджэт і е) арганізацыйны ступень школы.

§ 3. Кіраўніка школы, як роўна і вучыцелёў на іх пасадах, раней распачацьця навукі, зацьвярджае Школьны Інспэктар па выясьненьні кваліфікацыі.

§ 4. У прыватных пачатковых школах з няпольскай выкладовай мовай павінна быць і мова (польская), як абавязковы прадмет навукі ад II кл. і ў тым самым ліку тыднёвых гадзін, што і для выкладовай мовы, прычым у II кл. школы, дзе дзеці ня ведаюць польскае мовы, можа быць практыкавана сыстэма гутарак (pogadanek). Прадметы, датычачыя веды аб дзяржаве—як гісторыя і геаграфія—павінны выкладацца ў дзяржаўнай (польскай) мове.

§ 5. Праграма, плян навукі і школьныя падручнікі ў прыватных пачатковых школах зацьвярджае Куратар Школьнага Акругу.

§ 6. Наглядчымі ўладамі над прыватнымі школамі зьяўляюцца Школьны Інспэктар і Куратар Школьнага Акругу.

§ 7. Уласьнік школы адпавядае перад школьнымі ўладамі за матэрыяльнае становішча школы, а кіраўнік — за праграму навукі і выкананьце яе.

Інструкцыя падпісана Куратарам п. Гонсероўскім. Але нічога ня відаць на аснове якога закону пісана гэтая інстукцыя і чаму яна разыходзіцц з Польскай Канстытуцыяй?

Выглядае усё нібы зусім добра; школы прыватныя можна адчыняць. Пабачым, як-жа праводзіцца будзе ў жыцьцё школьнымі інспэктарамі гэтая інструкцыя, як будзе Куратар выдаваць канцэсіі на адчыненьне прыватных беларускіх школ. Праўда, п. Куратар азнаймляе, што гэтая інструкцыя мае сілу толькі з 1 лютага гэтага году, т. е. з сярадзіны школьнага году, калі фактычна цяжка бывае адчыніць школу. Але інспэктары мусіць быць і раней мелі пэўныя інструкцыі а[illegible]іх Куратараў. Ведаем мы толькі [illegible]о, як яны зачынялі прыватныя [illegible]еларускія школы.

Я думаю, што інстр[illegible] выданая Віленскім Куратарам, ня [illegible] яго ўласны твор, дык, мусіць, на [illegible]дставе пэўных правілаў Міністэрства, абавязкавых і для Куратара Беластоцкага. А падпа-

радкаваны апошнему школьны інспэктар Валожынскага павету п. Страчынскі Мечыслаў зачыніў на гэтых днёх ў сваім павеце апошнюю беларускую прыватную школу, абяцаючы ў афіцыяльнай паперы да вучыцелькі гэтае школы Мар'і Станкевічанкі аддаць яе пад суд. За што? за тое можа, што гэтая ідэёвая дзяўчына бесплатна вучыла дзяцей толькі чытаць, пісаць і лічыць.

За змаганьне з цемрай народнай, за пашырэньне асьветы, пачатковай навукі маюць папягнуць чалавека пад суд. Што-ж гэта? Мусіць таксама на падставе пэўных інструкцый робіцца гэта, што нашыя дзеці пазбаўляюцца асьветы. Цікава будзе даведацца на практыцы пры адчыненьні прыватных школ, ці адменены з гэтага 1 лютага ранейшыя інструкцыі ў справе прасьветы беларускай.

Міхалкаў Сымон.

Пісьмы з Прагі.

Усеславянскі студэнцкі Кангрэс.

Уадказ на прывітальную прамову сэнатара Клофача і Бэнэша выступаў беларус Т. Грыб, які зазначыў, што славянская солідарнасьць магчыма толькі пры поўным прызнаньні сувэрэннасьці і незалежнасьці кожнага славянскага народу, што новая эра славянскай культуры магчыма пры адраджэньні і разьвіцьці характэрных асаблівасьцяў кожнага славянскага народу, што ў канцовым выніку складзе адзіную гармонію багацьця гукаў, коляраў, формы, зьместу. 22-га сьнежня з прычыны таго што югаславянская дэлегацыя не адмовілася ад свайго ультыматыўнага дамаганьня, каб баўгарская дэлегацыя падпісала дэклярацыю аб тым, што баўгары-славяне і што баўгарскія студэнты засуджываюць дзейнасьць баўгарскага ураду пад час вайны, а баўгарская дэлегацыя адмовілася падпісаць дэклярацыю—адбыўся агульны сход дэлегатаў, на якім кожная дэлегацыя зложыла адпаведную дэклярацыю аб неадбыўшым Кангрэсе. Беларуская дэлегацыя з сумам констытуючы разьбіцьцё Кангрэсу з прычыны становішча, чыста палітычнага характару, дзе-якіх дэлегатаў, зазначыла пры гэтым, што ў час вялікай барацьбы беларускага народу за нацыянальную і соцыяльную волю, беларускае студэнцтва паслала сваіх дэлегатаў на непалітычны усеславянскі студэнцкі Кангрэс, кіруючыся думкай усеславянскай солідарнасьці, уважаючы гэта крокам наперад да агульналюдзкай солідарнасьці.

На гэтым і спыніўся ўсеславянскі студэнцкі Кангрэс.

Якое значэньне мае усеславянскі студэнцкі Кангрэс для нас беларусаў? Адказ на гэтае пытаньне дужа ясны і просты: зьдзейсьняюцца словы нашага песьняра Янкі Купалы—„Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між славянамі!“ І як-бы там ня было, а факт застанецца фактам—беларускія студэнты занялі роўные мейсца ў сям'і славянскага студэнцтва. Усеславянскі студэнцкі Кангрэс—гэта дэмонстрацыя, гэта прызнаньне правоў беларускага народу на яго вольнае бытаваньне. Хай сабе крычаць ад злосьці, як аблудлыя авечкі ворагі адраджэньня беларускага народу, хай злосна шыпяць, як тыя зьмеі падкалодныя—жыве беларускі народ!

Ідэя славянства... Само—сабой, мы самыя шчырыя прыхільнікі славянскае ідэі, але, мы ведаем, што кожная ідэя на столькі мае вартасьці, на колькі яна ў канкрэтным жыцьці прымяніма, на колькі дапамагае жыць як вялікай людзкой грамадзе, так і кожнай чалавечай адзінцы. Што дае канкрэтнага беларускаму народу славянская ідэя?—„Славянскую солідарнасьць?“ Але дзе тая солідарнасьць, калі нас ціснуць духоўна і фізычна нас зьнішчаюць, нашыя-ж браты славяне?!—Вот-жа, тым з большай сілай, тым з большай энэргіяй мы беларусы мусім даводзіць нашым „братом“ — што яны занадта ўжо „пабратоўскаму“ да нас адносяцца, а што было-б ляпей, каб мы пачалі жыць, як добрыя, сумленныя суседзі, зразумеўшы узаемную карысьць солідарнага супрацоўніцтва.—Покліч д-ра Бэнэша—няхай жыве славянская солідарнасьць!—нам беларусам вельмі шмат аб чым кажа. У сьлед за Бэнэшам мы скажым: Няхай жыве славянская солідарнасьць, як адзін з этапаў на шляху да зьдзейсьненьня солідарнасьці усіх людзей і народаў!

В. С. Р.

Змаганьне за беларускую школу.

◆ Забрэзьская гміна Валожынскага павету пастанавіла 24. X. 22 г. далучыцца да просьбы сялян аб адчыненьні беларускіх школ у вёсках Гародзькі, Вялікае-Запрудзьдзе, Ганькавічы, Кашчэлічы, Лістапады, Дайнава і Гарадзешня. Пастанова гэтая зацьверджана павятовым старостам, але інспэктар школьны Валожынскага павету і далей упіраецца, ня хочучы даць дазвол на афіцыяльнае істнаваньне там беларускіх школ. Адчыненыя ў памянёных вёсках прыватныя беларускія школы, перапоўненыя вучнямі, зачынены паліцыей. Паліцыянты грубым спосабам трактавалі дзяцей-школьнікаў, самую школу, як беларускую, вучыцялёў перад дзецьмі, адбіраючы беларускія падручнікі і пазбаўляючы вучыцелек права змагацца з пануючай цяпер на вёсках цемрай.

◆ Школу беларускую ў Ганькавічах турбавала паліцыя аж чатыры разы, змушаючы вучыцельку Станкевічанку Мар'ю спыніць навуку для дзяцей. У кожнай з гэтых школ, у працягу 2—3 дзён запісалася дзяцей ад 40 да 70, а ў школу польскую у вёсцы Гародзькі, дзе на пэнсіі ёсьць 3 вучыцелі, хадзіла раней толькі пяцёра дзяцей з суседняга маёнтку, а цяпер і тыя ня ходзяць.

◆ Для адчыненьня ў свой час школы польскай у вёсцы Гарадзешня польскі вучыцель з'явіўся пад ахранай паліцыянта, але праз некаторы час зусім пакінуў вёску, не знашоўшы там ані воднага для себя вучня.

◆ У м. Валожыне беларуская вучыцелька Маеўская адчыніла прыватную беларускую школу 1-го сьнежня 1922 г., а 2-га сьнежня школа была ўжо зачынена мясцовай уладай.

◆ У вёс. Зачэпічы, Лідзкага павету была беларуская прыватная школа, але мясцовая школьная улада зачыніла яе, тлумачучы тым, што вучыць можна толькі папольску.

Дапісы.

Няма спакою. Часта густа каля нас чуваць грабежствы і забойствы. 24 студня ў вёсцы Путніках, Вялейскага павету было такое здарэньне. Ноччу да аднаго з гаспадароў прышлі узброеныя 4 паліцыянты і 4 у цывільнай вопратцы і загадалі выдаць доляры, бо гэты гаспадар быў калісь у Амэрыцы і меў крыху доляроў. Доўга грабежнікі зьдзекаваліся над ахвярай, урэшце дабіліся таго, што гаспадар аддаў грошы. Забраўшы усё лепшае ў хаце і зьвязаўшы гаспадара грабежнікі уцяклі.

М. С.

Даюцца ў знакі. У мястэчку Даўгінава, Вялейскага павету жаўнеры, якія там стаяць уздумалі побач з царквой на царкоўнай зямлі будаваць баракі. Прыхажане прасілі ня будаваць і пратэставалі, але нічога не памагло. Тады была паслана просьба да мітрапаліты, але пакуль ніякага адказу няма, а тымчасам жаўнеры што хацелі тое і зрабілі: пры самай сьвятыні узбудавалі баракі.

Мястэчковы.

Паважаны Рэдактар!

Будзьце ласкавы, памясьціць маё пісьмо у сваей газэце! Хачу апісаць сваё гора, ды ня так гора, як жаль балючы. Справа вось у чым: Даведаўся я, што выходзіць газэта „Наша Будучына“, выпісываю, чакаю... няма! Што за дзіва! На шчасьце папала мне быць у Вільні. Аказываецца, што газэту мне пасылалі, клеілі маркі, кідалі на пошту, аднак ня прыйшла. Чаму ня прыходзіла? чаму? „Пытаўся мужык у пана: чаму ён б'ецца ад раньня? Ах, кажа, хлопе мілы: я маю болей сілы!„ Вот і уся прычына. На поштах сідзяць эндэкі, або беларусы-здраднікі, дык яны губяць нашую літэратуру. Што робіць беларус, калі ня можа перамагчы гора, крыўды? кляне. Я ужо не адзін раз пісаў у газэты, наракаў на пошту—нічога не памагло, дык сягоня я хацеў-бы таксама праклясьці па беларуску усіх душагубцаў, прадажнікаў, здраднікаў. Хоць я гэтым свайму гору не памагу, але лягчэй мне будзе на сэрцы.

І яшчэ хочу я сказаць для усіх паноў эндэкаў, якія хочуць спыніць нашу працу. Паны! вы лішне позна агледзіліся. Мужык заўсяды ад вас раней уставаў-штодзень бачыў усход сонца, а вы бачыця толькі заход; вось вам і ваша слава тутэйшая пойдзе на заход; а наша доля узыйдзе. Хоць вы трэсьніце, дык ужо мы вас не баімся.

Хлопчык з пад Гарадні.

З Беларускага жыцьця.

◆ Вышаў з друку і прадаецца ў Беларускай кнігарні (Завальная 7) „Зборнік пьес дзіцячага тэатру“.

◆ Староста ў Глыбокім не даў дазволу на пастаноўку спэктакля ў Дзісьне на 11-га лютана.

◆ У нядзелю 28-га студня у царквы Св. Твойцы ў Вільні сэмінарыст К. Шашко казаў казаньне па беларуску. Вялікі натоўп народу праслухаў з увагай і зацікаўленасьцяй доўгую і багатую прамову.

◆ У чэцьвер 1-га лютага у залі артыстаў плястыкаў, беларускія студэнты ладзілі вялікую вечарыну. Прадстаўлена было „Бутрым Няміра“ ар. Аляхновіча і дывэртысмэнт. Пьесу згулялі добра. Публікі было шмат.

◆ Вучнёўская вечарына. Віленскай беларускай вучнёўскай моладзю ладзіцца 17 гэтага месяца ў суботу спэктакль-вечар. Рыхтуецца да пастаноўкі вядомая рэч В. Марцінкевіча „Пінская Шляхта“, якая ідзе цершы раз у Вільні. Апрача гэтага выступіць хор і інш.

Увесь даход пойдзе на культурна-прасьветныя мэты і сяброўскую дапамогу.

Пасьля прадстаўленьня танцы, на залі да раніцы пад гукі вайсковага аркестра.

◆ Вучнёўска вечарына. 27 студня г. г. вучнямі Віл. Беларускай Гімназіі была ладжана вечарына на карысьць незаможных вучняў гімназіі. Нягледзючы на тое, што вечарына дала добры даход і была людная, далёка незадаволіла прысутных з боку праграмы. Гэты вечар быў першым вучнёўскім вечарам ў бягучым вуч. годзе і ўсе спадзяваліся на больш паважную мастацкую праграму. Віленскае грамадзянства прывыкла бачыць ў вучнёўскіх вечарынах Белар. Гімназіі асабліва вартае ўвагі, але на гэты раз ашукалася. Пастаўлена была пьеса „Іванаў Паўла“ расейская апэрэтка, праўда ў беларускай мове, але даўно згубіўшая вартасьць, асабліва для нас беларусаў.

Што датычыць другога аддзелу—канцэртнага, дык застаецца прывітаць думку дэклямацыяў у рожных мовах. Шкода толькі, што хор гімназіяльны не пяяў.

Добра ўдаліся лявоніха ды юрка, выкананыя дзяцьмі малодшых клясаў. Ня меншае ўражаньне зрабілі беларускія танцы і на залі, калі пад гук духавога аркестру сыпнула добрая палова танцуючых. Апрача нашае моладзі, на вечарыне шмат было моладзі літоўскае, польскае і інш. Дужа шкада, што толькі трапіла яна на такую неўдалую праграму.

Хай жа гэты закід будзе на будучыну перасьцярогай для вучняў а Пэдагагічная Рада Гімназіі ў другі раз няхай аднясецца больш крытычна пры зацьвярджэньні праграмы.

Збор даволі добры. Жыва праходзіла лётарэя, кабінэт цудаў і іншае.

М. Чир.

Аб Кракаўскіх курсах.

Яшчэ з вясны 1921 г. інспэктары школьныя сталі разпаўсюджаваць чуткі, што ў летку распачнуцца курсы „dokształcające“ у Кракаве для настаўнікаў былых школ беларускіх і расейскіх. Была гутарка аб тым, што гэтыя курсы дадуць кваліфікацыю. І веручы ў атрыманьне гэнай кваліфікацыі, вучыцялі сталі запісывацца на курсы. Праўда большасьць была такіх, што ня верылі ўжо пекным слоўцам і засталіся чакаць вынікаў. У Навагрудзкім ваяводзтве больш як 1500 настаўнікаў, на курсы запісалася ўсяго 250, ці каля 17 прац.

Цяпер, 20 сьнежня, курсы скончыліся. Настаўнікаў распусьцілі дамоў, сказаўшы што пасьведчаньне будуць кожнаму прысланы. І праўдзіва ў палавіне студня месяца кожны настаўнік атрымаў пасьведчаньне, дзе сказана, што кончыўшы курсы ёсьць «tymczasowym nauczycielem». І гэтак, ён мусіць яшчэ слухаць вакацыйныя курсы, аб ім будуце зьбірацца спраўкі і толькі каля 1926 году ён атрымае кваліфікацыю. А цяпер ён, стары настаўнік, скончыўшы адпаведныя пэдагагічныя школы, ўсё жыцьцё ахвяраваўшы для вялікой асьветнай справы, зраўняны з якімсь здэмабілізованым на поўпісьменным жаўнерам, альбо галіцыйскім бюракратам.

Так бадай што толькі ў нас бывае.

Сярод настаўніцтва пануе вялікае абурэньне. Цяпер ужо веры ня будзе, бо кажаць, ашуканствам сьвет пяройдзеш, але назад ня вернешся.

У. Н.

Адкрытае пісьмо да Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні.

Свайго часу я чытаў у беларускіх газэтах аб арганізаваньні ў Вільні Белар. Нав. Т-ва. Прайшло з таго часу ўжо каля году. Нічога аб працы Т-ва мы, правінцыялы дагэтуль ня чулі. Магчыма, што там у вас, у Вільні, як у цэнтры беларускае працы Заходняе Беларусі, і рабілася што-небудзь—мо' і чыталіся рэфераты ды даклады навуковага зьместу, апрацоўвалася тэрміналёгія і г. д., але паскольку аб усім гэтым не друкавалася ў газэтах беларускіх, на старонках якіх прывыклі мы бачыць адбіцьцё беларускага і культурнага жыцьця, дык дагэтуль мы нічога ня ведаем аб працы Таварыства.

У сучасны момант, калі мы, беззработныя беларускія вучыцялі, выбіваемся з сілаў, змагаючыся за сваю школу, і ўсё-ж застаёмся без працы пакуль што, хацелі-б заняцца перакладамі на беларускую мову ў вольны час твораў прыгожага пісьменства з польскае і расейскае мовы, а таксама складаньнем ці компіляцыей матэр'ялаў для беларускіх школьных падручнікаў. Але нам дасканальна няведама, што ў першую чаргу патрэбна. Гэта трэба нам сказаць. Магчыма, што хто-небудзь ужо заняты дзе гэтаю працай, дык вось, каб не паўтарацца, трэба апавешчаць.

Не хацелася-б марна траціць тады другому паперы на гэта, якая цяпер надта дорага, ды набываць для перакладу творы чужаземных аўтараў, кніжкі якія так сама не танны.

Трэ, было-б скоордынаваць гэтую работу і я мысьлю, што гэтым павінна заняцца якраз Навуковае Т-ва, якому відней, што патрэбна як падручнікі школьныя, пераклады сцэнічных твораў (каб ня было больш «Івановых Паўлаў» кніг па садоўніцтву, агародніцтву, земляробству, пчалярству і інш.

Праца Бел. Выдавец. Т-ва ў гэтым годзе ідзець нешта слабавата, калі прыпрыняць пад увагу тое, што было выпушчана ў сьвет і аб чым паведамлялася ў беларускіх газэтах, але з тых-жа газэт мы бачам („Наша Будуч.“ № 4), што выдавецтва Б. А. Клецкіна ўсьцяж друкуе беларускія кніжкі. Можа гэтае выдавецтва занялося-б і друкаваньнем адпаведных перакладаў, каліб іх апрабавала такая паважная інстытуцыя, як Навуковае Таварыства. Над гэтым варта было-б паразважыць.

Прашу Бел. Нав. Т-ва не палічыць за крыўду для сябе, высказаныя тут мае погляды на выдавецкую справу і практычныя ўвагі.

Баўтручонак.

Курс на грошы.

(Віленская біржа.)

за 27 студня.

Золата 10 р.	200000
Доляры	34500

З прычыны ўзросту даравізны падпіска павялічана да 1200 м, у месяц.

Просім падпішчыкаў унясьці даплату.

Рэдактар-выдавец А. АМЕЛЬЯНОВІЧ. Друкарня „ДРУК“ Субач, 2.